Д. І. Сініца

# У ПОШУКАХ ПРАЎДЫ ПРА С.А. ПААНЯТОЎСКАГА, ЦІ ПАДАРОЖЖА ПА СЛЯДАХ АПОШНЯГА КАРАЛЯ

*Разглядаюцца асноўныя вехі жыцця апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Паянтоўскага.*

Некаторыя даследчыкі называюць яго асветнікам, мецэнатам і выбітным рэфарматарам, іншыя, лічаць ледзь не здраднікам. Якім жа быў на самой справе апошні кароль Рэчы Паспалітай? Нарадзіўся Станіслаў Антоні Панятоўскі 17 студзеня 1732 г. у мястэчку Воўчын Берасцейскага павета ў сям'і Станіслава Панятоўскага і яго другой жонкі князёўны Канстанцыі Чартарыйскай.

Настаўнікам Станіслава Антонія быў расійскі пасол Герман Кайзерлінг, былы прафесар каралеўскага ўніверсітэта. Акрамя логікі і матэматыкі, ён тлумачыў юнаку палітычныя ісціны, чытаў трактаты аб маральных нормах і этыцы ў палітыцы і жыцці. Хатняе выхаванне і адукацыя дазволілі хлопчыку цудоўна авалодаць польскай, французскай, рускай, англійскай і іншымі мовамі, ведаць латынь. Сваю адукацыю Панятоўскі працягнуў у калегіуме тэатынаў у Варшаве.

У 1748 г. Станіслаў Панятоўскі адправіўся ў падарожжа ў суправаджэнні маёра Кінігсфельса, каб перадаць лісты бацькі да маршалаў дэ Сакса і Левенфельда, а таксама яго сябрам . Ім былі наведаны Францыя, аўстрыйскія Нідэрланды і Галандыя.

З 1748 г. Станіслаў амаль год практыкаваў канцылярскую справу ў свайго дзядзькі Міхаіла Чартарыйскага ў Воўчыне. Менавіта ў гэты час ён адчуў, як раскручваецца механізм палітычнай групоўкі "сям'і". Пазней у сваіх мемуарах апошні кароль чамусьці прызнаў гэты год марным.

Паступова будучы кароль узыходзіў па службовай лесвіцы, займаўся дыпламатычнымі справамі, удзельнічаў у палітычных і сямейных гульнях, пераймаў вопыт кіравання каралеўскіх асоб.

У 1755 – 1764 гг. ён займаў ганаровую пасаду стольніка ВКЛ. У 1755 г. атрымаў пасаду сакратара англійскага пасольства ў Пецярбургу. У гэты ж час і адбылося знаёмства з вялікай княгіняй Кацярынай Аляксееўнай, у будучым імператрыцай Кацярынай ІІ. Некалькі таемных сустрэч яшчэ больш павялічылі цікавасць Станіслава да яе. Цяпер усё яго існаванне было прысвечана ёй. У Станіслава і Кацярыны нават нарадзілася дачка, якую назвалі Ганнай, але, на жаль, дзіця памерла ў двухгадовым узросце. Раман з Кацярынай перарадзіўся ў ашаламляльныя перспектывы. Пасля смерці караля польскага і вялікага князя літоўскага Аўгуста ІІІ Чартарыйскія і Кацярына ІІ выставілі кандыдатуру Стансіслава Панятоўскага на трон Рэчы Паспалітай. Дакладна невядома, быў гэта халодны разлік ці падтрымка былога фаварыта, але бясспрэчна адно: размова ішла аб пастаўленні на чале дзяржавы паслухмянага чалавека. У Рэч Паспалітую былі ўведзены расійскія войскі і на выбарчым сейме 6 верасня 1764 г. Станіслаў быў абраны каралём. Пасля гэтага ўзяў імя Аўгуст. 25 верасня 1764 г., у дзень святой Кацярыны, у Варшаве адбылася каранацыя Станіслава Аўгуста Панятоўскага, якому было ўсяго 32 гады.

Пачалося яго праўленне даволі спакойна. Краіна мела вострую патрэбу ў рэформах. Новаабраны кароль разам з Чартарыйскімі спрабаваў вызваліцца ад поўнай залежнасці ад Расіі, узмацняў дзяржаўную ўладу, абмежаваў "ліберум вета", выступаў за пагадненне з апазіцыйнай групоўкай Патоцкіх ("рэспубліканцаў"), дбаў пра развіццё гарадоў, аказваў маральную і матэрыяльную падтрымку дзейнасці вучоных і літаратараў.

Рэформы ўзмацнілі дзяржаву, але ўстрывожылі Расію і Прусію. 11 красавіка 1764 г. яны заключылі паміж сабой сакрэтны саюзны дагавор. 22 ліпеня 1764 г. імі была падпісана Дэкларацыя, а 23 красавіка 1767 г. Сакрэтная канвенцыя, тэма якіх – правы дысідэнтаў. Быў створаны шэраг канфедэрацый (Торуньская, Слуцкая, Радамская), якія выступалі за рашэнне гэтага пытання на карысць дысідэнтаў і карысталіся падтрымкай расійскіх войскаў. На сойме, які праходзіў у Варшаве з 5 кастрычніка 1767 г. па 27 лютага 1768 г. расійскі пасол Рапнін прымусіў сойм прыняць закон аб ураўнаванні дысідэнтаў у правах з каталікамі. Адказам на гэта з боку польскай шляхты было стварэнне Барскай канфедэрацыі (1768—1772), якая выступіла супраць рашэння сойма і пачала ваенныя дзеянні супраць расійскіх і каронных войскаў. Мяцеж паслужыў падставай для патрабавання Аўстрыі і Прусіі падзяліць польскія землі, па прычыне нeздольнасці Рэчы Паспалітай падтрымліваць парадак на сваёй тэрыторыі. У гэтых умовах Расія пагадзілася на частковы падзел Рэчы Паспалітай. Значная частка Рэчы Паспалітай перайшла пад кантроль суседніх дзяржаў.

Станіслаў не адважыўшыся пратэставаць, пакорліва прыняў дадзенае рашэнне. Пасля перша-

га падзелу ў барацьбе паміж рознымі магнацкімі групоўкамі ён паступова ўзмацніў сваю ўладу. У 1775 г. была створана Пастаянная Рада – цэнтральны орган выканаўчай улады на чале з каралём, прыняты рашэнні, накіраванныя на развіццё прамысловасці і гандлю. Каралём былі наведаны Белавежская пушча, Пінск, Нясвіж і Гродна. Панятоўскі верыў, што прасвятленне розуму народа, асабліва шляхты, – гэта адзіны шлях да ўзмацнення краіны. У той час у жыцці Рэчы Паспалітай велізарную ролю мела патрыятычная партыя, у склад якой увайшло маладое шляхецтва, таму Станіслаў Аўгуст вырашыў абаперціся на патрыётаў. У хуткім часе быў скліканы Чатырохгадовы сейм, галоўным вынікам якога стала прыняцце дакумента, які падкрэсліваў незалежнасць Рэчы Паспалітай і недатыкальнасць яе межаў. 3 мая 1791 г. у Варшаве была прынята першая ў Еўропе Канстытуцыя. Згодна з ёю, Рэч Паспалітая была абвешчана ўнітарнай краінай, у якасці дзяржаўнай рэлігіі ўводзіўся каталіцызм, дзяржаўнай мовы – польская. З гэтым не змірылася група кансерватыўных магнатаў, якія стварылі Таргавіцкую канфедэрацыю, Акт якой быў падпісаны ў Санкт-Пецярбургу 27 красавіка 1792 г. Яе падтрымала Расійская імперыя, здзейсніўшы інтэрвенцыю ў Рэч Паспалітую. Станіслаў заклікаў да барацьбы з праціўнікамі рэформаў. Нягледзячы на тое, што канстытуцыя мела шмат прыхільнікаў, Рэч Паспалітая не магла даць адпор добра падрыхтаванай арміі Расійскай Імперыі. Станіслаў спадзяваўся на дапамогу Прусіі згодна з заключаным абарончым саюзам, але яна адраклася ад саюзніцкай дапамогі Рэчы Паспалітай, бо мела сакрэтныя дамоўленасці з Расіяй на конт другога падзелу. У скорым часе ўся краіна апынулася пад уладай Таргавіцкай канфедэрацыі і Аўгусту прыйшлося далучыцца да яе. У краіну зноў былі ўведзены спачатку расійскія, а потым і прускія войскі. 23 студзеня 1793 г. Расія і Прусія падпісалі канвенцыю аб другім падзеле Рэчы Паспалітай.

Ледзьве не адзіным генералам, які паспрабаваў абараніць межы дзяржавы быў Тадэвуш Касцюшка. Ён разам з 6 тыс. чалавек здолеў спыніць 30 тыс. корпус генерала Кахомскага. Стаў лідарам патрыятычнай арміі, каб у 1794 г. узначаліць паўстанне.

Станіслаў Аўгуст Панятоўскі з Касцюшкам быў у добрых адносінах. Тадэвуш гарантаваў яму бяспеку і ахову ад распраў, але ўсё ж такі трымаўся крытычнай дыстанцыі. Кіраўнікі паўстання лічыліся з ім, як з законным і легітымным манархам, бо без яго ўдзелу не мог быць прызнаны іншымі дзяржавамі ні адзін палітычны дакумент, прыняты новымі ўладамі. Але праз некаторы час паўстанне было задушана, Касцюшка ўзяты ў палон, а Панятоўскі пакінуў Варшаву. У пісьме да расійскай імператрыцы 21 лістапада 1794 г. Станіслаў Аўгуст, заклікаючы да яе мудрасці, прасіў аб гуманных адносінах да разбуранай вайной краіны. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 г. Панятоўскі быў вымушаны жыць у Новым замку ў Гродне. Станіслаў Аўгуст прытрымліваўся жорсткага рэжыму і размеранага ладу асабістага жыцця. Увесь вольны час Станіслаў шмат чытаў і пісаў. 25 лістапада 1795 г. з лёгкай рукі Кацярыны II яму даставілі на подпіс акт адмовы ад прастолу. Пасля смерці Кацярыны II яе сын Павел I прапанаваў Станіславу Аўгусту пераехаць з Гродна ў Пецярбург і манаршым жэстам аддаў яму Мармуровы палац, найпрыгажэйшы ў сталіцы пасля Зімняга. 12 лютага 1798 г. былога манарха Рэчы Паспалітай не стала. Пахаванне было сапраўды каралеўскім. 5 сакавіка труну з целам урачыста перанеслі з Мармуровага палаца ў месца спачыну – касцёл св. Кацярыны на Неўскім праспекце. Прыстанішча ў Пецярбургу не стала апошнім. У выключнай сакрэтнасці 15 ліпеня 1938 г. труна з прахам апошняга караля Рэчы Паспалітай была перавезена ў Воўчынскі касцёл. Пазней рэшткі каралеўскага пахавання былі перададзены на рэстаўрацыю і кансервацыю ў Каралеўскі замак Варшавы. Амаль шэсць гадоў яны знаходзіліся на захаванні ў сховішчах гэтага замка. Нарэшце, польскія ўлады вырашылі правесці ўрачыстую цырымонію іх перазахавання, якая адбылася 14 лютага 1995 г. Пасля цырымоніі ў замку, пахавальная працэсія рушыла да касцёла св. Іаана Хрысціцеля, дзе некалі адбылася яго каранацыя. Урна разам з лістом, які сведчыў аб паходжанні рэшткаў, былі памешчаны ў спецыяльны саркафаг.

### *Спіс літаратуры*


1. Несцярчук, Л.М. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі – манарх, асветнік, мецэнат/ Л.М. Несцярчук. – Брэст: ААТ "Брэсцкая друкарня", 2011. – 300 с.
2. Бутэвіч, А. Славутыя родам сваім/ А. Бутэвіч. – Мінск: Мінская фабрыка каляровага друку, 2006. — 32 с.: іл.
3. Мартенс, Ф-Ф. Собрание трактатов и конвенций, заключенных Россией с иностранными державами/ Ф- Ф. Мартенс. В 15 т. – Т. 6: Трактаты с Германией. – :СПБ.: Тип-я Министерства путей сообщения, 1883. – 501 с.



*Синица Дмитрий Игоревич*, студент ФИТиУ БГУИР, man.upon.problems@gmail.com
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, зав.кафедрой гуманитарных дисциплин, к. и. н., доцент.